БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Прарэктар па вучэбнай рабоце

_____________ А.Л. Толсцік

25.11.2016 2016 г.

Рэгістрацыйны № УД- 3307 /вуч.

# УВОДЗІНЫ Ў ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**

**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей**

21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)
1- 21 05 04 Славянская філалогія

2016 г.

Вучэбная праграма складзена на основе тыпавой праграмы "Уводзіны ў літаратуразнаўства" (рэгістрацыйны № ТД-Д.302/тып., зацверджана 2.05.2014) і вучэбных планаў па спецыяльнасцях 21 05 01 Беларуская філалогія, 21 05 04 Славянская філалогія, рэгістрацыйныя № Д21-079/уч.; Д21-080/уч.; Д21-081/уч.; Д21-088/уч.

**СКЛАДАЛЬНІК**

В. П. Рагойша, прафесар, доктар філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**

Кафедрай тэорыі літаратуры БДУ (пратакол № 9 ад 18. 05.2016 г.),

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 6 ад 31. 05. 2016 г.).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэта дысцыпліны** “Уводзіны ў літаратуразнаўства”: паглыбіць і пашырыць атрыманыя ў сярэдняй школе веды студэнтаў па літаратуразнаўству, дапамагчы авалодаць асноўнымі навыкамі літаратуразнаўчага аналізу, закласці трывалыя асновы для вывучэння “Тэорыі літаратуры”.

**Задачы дысцыпліны:**

- паказаць важнасць літаратуразнаўчых ведаў для ўспрымання і вывучэння мастацкай літаратуры, спасціжэння іншых літаратуразнаўчых навук;
- раскрыць сутнасць асноўных літаратуразнаўчых паняццяў, катэгорый, тэрмінаў;
- даць студэнтам звесткі пра комплекс як галоўных, так і дапаможных літаратуразнаўчых дысцыплін, іх своеасаблівасць і ўзаемасувязь;
- навучыць разумець літаратурны твор як мастацкае цэлае, у адзінстве кампанентаў зместу і формы.

Дысцыпліна ўваходзіць у дзяржаўны кампанент цыкла агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін (для дзённай формы навучання) і ў абавязковы кампанент цыкла агунапрафесійных і спецыяльных дысцыплін (для завочнай формы навучання).

Дысцыпліна “Уводзіны ў літаратуразнаўства” знаходзіцца на пачатковым этапе вывучэння тэарэтычнага і гістарычнага літаратуразнаўства, дазваляе закласці асновы ведаў аб паняццях і катэгорыях навукі пра літаратуру, дае ўяўленне пра ўвесь комплекс літаратуразнаўчых навук. Мае цесныя сувязі з такімі дысцыплінамі, як “Фальклорыстыка”, “Славянская міфалогія”, “Гісторыя беларускай літаратуры”, “Гісторыя рускай літаратуры” і інш.

**Патрабаванні да ўзроўню засваення дысцыпліны:**

Па выніках вывучэння дысцыпліны “Уводзіны ў літаратуразнаўства” студэнты павінны **ведаць**:

- асноўныя тэарэтычныя паняцці, звязаныя з эстэтыкай і паэтыкай літаратурнага твора, літаратурным працэсам;
- сістэму літаратуразнаўчых дысцыплін і іх сувязі з дапаможнымі галінамі літаратуразнаўства, іншымі гуманітарнымі навукамі;
- спецыфічныя асаблівасці эпасу, лірыкі і драмы як родаў літаратуры, празаічнай і вершаванай формаў выказвання, асноўныя стылеўтваральныя сродкі і кампаненты.

Студэнты павінны **ўмець**:

- вызначаць асноўную ідэйную скіраванасць, тэматыку і праблематыку, пафас літаратурных твораў;
- разглядаць мастацкі твор у адзінстве яго зместу і формы;

- выяўляць асаблівасці стылю пісьменніка, яго творчай індывідуальнасці;
- аналізаваць літаратурныя творы, вызначаць іх мастацкія вартасці і магчымыя недахопы.

Студэнты павінны **валодаць**:
- комплексам сучасных тэарэтыка-літаратурных тэрмінаў і паняццяў:
- асноўнымі прынцыпамі літаратуразнаўчага аналізу, неабходнымі для больш глыбокага асэнсавання гісторыка-літаратурных курсаў, напісання рэфератаў, семінарскіх, курсавых і дыпломных работ.

Засваенне вучэбнай праграмы павінна забяспечыць фарміраванне наступных **кампетэнцый**:

АК-1. Умець прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальныя аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

СЛК-7. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

ПК-7. Лагічна, аргументавана і ясна выказвацца вусна і пісьмова, карыстацца навыкамі публічнага маўлення, вядзення дыскусіі і палемікі.

ПК-13. Прымяняць сучасную метадалогію лінгвістычных і літаратуразнаўчых даследаванняў, выкарыстоўваць сродкі аўтаматызацыі праектавання, афармляць праектную дакументацыю.

Агульная колькасць гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне дысцыпліны па спецыяльнасці 1-21 05 01 (беларуская філалогія, па напрамках) – 114 гадзін.

Колькасць аўдыторных гадзін – 52.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – вочная.

Размеркаванне аўдыторнага часу па відах заняткаў, курсах, семестрах:

30 гадзін – лекцыйныя. 16 гадзін – практычныя. 6 гадзін – КСР,

Заняткі па дысцыпліне праходзяць у першым семестры.

Форма бягучай атэстацыі па дысцыпліне – экзамен (у 1-м семестры).

Агульная колькасць гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне дысцыпліны па спецыяльнасці 1-21 05 04 (славянская філалогія) – 114 гадзін.

Колькасць аўдыторных гадзін – 52.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – вочная.

Размеркаванне аўдыторнага часу па відах заняткаў, курсах, семестрах:

26 гадзін – лекцыйныя. 20 гадзін – практычныя. 6 гадзін – КСР,

Заняткі па дысцыпліне праходзяць у першым семестры.

Форма бягучай атэстацыі па дысцыпліне – экзамен (у 1-м семестры).

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 1. Літаратуразнаўства як навука.

Літаратуразнаўства як навука, сувязь яго з лінгвістыкай, гуманітарнымі дысцыплінамі, ідэалогіяй. Галоўныя галіны літаратуразнаўства: гісторыя, тэорыя літаратуры, літаратурная крытыка. Дапаможныя галіны літаратуразнаўства: гістарыяграфія, бібліяграфазнаўства, тэксталогія, бібліятэказнаўства, архівазнаўства, музеязнаўства, краязнаўства і інш.

### 2. Літаратура як від мастацтва.

Навуковае і мастацкае пазнанне жыцця Функцыі літаратуры, яе месца сярод іншых відаў мастацтва. Літаратура і навука, рэлігія, іэалогія. Грамадзянскасць, сацыяльнасць, партыйнасць, гуманізм літаратуры. Мастацкая тыпізацыя. Разуменне тыповага ў жыцці і літаратуры. Прыёмы і спосабы тыпізацыі

### 3. Мастацкі вобраз.

Літаратурны вобраз. Вызначэнне тэрміна ”вобраз” і яго шматзначнасць. Мікравобразы і макравобразы. Тропы: вызначэнне, віды. Вобраз лірычнага героя. Вобраз-персанаж і спосабы яго стварэння.

### 4. Роды, віды і жанры літаратурных твораў.

Роды (эпас, лірыка, драма) і віды літаратуры. Ліра-эпічныя віды літаратуры (паэма, балада, байка). Літаратурныя жанры. Жанры эпічных, драматычных, лірычных твораў. Жанры і жанравыя разнавіднасці.

### 5. Проза і паэзія. Вершазнаўства.

Верш і паэзія. Верш і проза. Рытміка і метрыка. Сістэмы вершавання: антычная, сілабічная, танічная, сілаба-танічная, верлібрыстычная. Фоніка. Рыфміка. Функцыі і віды рыфмаў. Строфіка. Класічныя віды строфаў: санет, трыялет, актава, тэрцыны і інш. Паэтычны сінтаксіс, яго формы і віды.

### 6. Змест і форма літаратурных твораў.

Мастацкі свет літаратурнага твора, выяўлены ў мове і праз мову. Катэгорыі зместу: ідэя, тэма, матыў, пафас, хранатоп, сюжэт, сістэма персанажаў, апісанні, мастацкая дэталь... Паэтыка як форма літаратурнага твора ў яе сэнсавыяўленчай сутнасці. Катэгорыі формы лірычных, эпічных і драматычных твораў. Адзінства зместу і формы мастацкіх твораў.

### 7. Літаратурны працэс.

Літаратурны працэс. Літаратурныя метады (класіцызм, сентыменталізм, рамантызм, рэалізм, мадэрнізм) і напрамкі (крытычны і сацыялістычны рэалізм, сімвалізм, футурызм, імажынізм і інш.). Разуменне стылю пісьменніка. Стылёвыя плыні ў літаратуры. Літаратурныя сувязі, іх віды (кантактныя, генетычныя, тыпалагічныя). Мастацкі пераклад.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

## Спецыяльнасць 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках)

| | | Колькасць гадзін | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю заняткаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | КСР – кіруемая самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| . | **Усяго аўдыторных гадзін – 52, з іх:** | **30** | **16** | **6** | | | |
| **1.** | **Літаратуразнаўства як навука ( 8 гадз.)** | **6** | **2** | | Курс лекцый, плакат «Літаратуразнаўства як навука» | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.9;1.12; 2.6; 3.21 | |
| 1.1. | Літратуразнаўства як навука (доказ), сувязь яго з лінгвістыкай, гуманітарнымі дысцыплінамі, ідэалогіяй. Вучэбная літаратура. | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 1.2. | Галоўныя галіны літаратуразнаўства. Сутнасць гісторыі літаратуры і літаратурнай крытыкі, іх блізкасць і адрозненне. | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3. | Тэорыя літаратуры як літаратуразнаўчая дысцыпліна.Сутнасць, азначэнне, раздзелы: паэтыка, эстэтыка літараткры, тэорыя літаратурнага працэсу, метадалогія літ-ва. | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 1.4. | Дапаможныя галіны літаратуразнаўства: гісторыяграфія, бібліяграфазнаўства, тэксталогія, кнігазназнаўства, архівазнаўства, археаграфія, палеаграфія, музеязнаўства, бібліятэказнаўства, біяграфістыка, храналогія. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.12; 2.6; 3.21 | Апытанне па хатнім заданні |
| **2.** | **Літаратура як від мастацтва (6 гадз.).** | **4** | | **2** | Курс лекцый, камп'ютар. прэзентацыі, маст. тэксты | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.9;1.12; 2.6; 3.24 | |
| 2.1. | Навуковае і мастацкае пазнанне жыцця. Функцыі літаратуры Літаратура і грамадскае жыццё.. | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 2.2. | Літаратура і ідэалогія Грамадзянскасць, сацыяльнасць, партыйнасць, гуманізм літаратуры. | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 2.3. | Мастацкая тыпізацыя. Разуменне тыповага ў жыцці і літаратуры. Прыёмы і спосабы тыпізацыі. | | | 2 | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытанне па хатнім заданні |
| **3.** | **Літаратурны вобраз (12 гадз.).** | **4** | **6** | **2** | Курс лекцый, камп'ют. прэзентацыі, маст. тэксты | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8;1.9;1.12; 2.6; 3.10; 3.16. 3.24 | |
| 3.1. | Вобразная сутнасць мастацтва. Тэрмін «вобраз», яго разуменне, шматзначнасць у літаратуры. Віды вобразаў.  Мікравабразы і макравобразы. | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 3.2. | Вобраз-персанаж і спосабы яго стварэння. Вобраз і прататып. Вобраз лірычнага героя. Вечныя вобразы. | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.3. | Вобразы прасторы і прадметнага свету. Хранатоп. Пейзаж і локус. Вобразы індывідуальныя, хара́ктарныя, тыпавыя, вобразы-матывы і топасы, архетыпы, міфалагемы/міфемы. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытанне па хатнім заданні |
| 3.4. | Вобразныя магчымасці нацыянальнай мовы: вузкаўжывальная лексіка (дыялектызмы, жарганізмы, аргатызмы, прафесіяналізмы і г. д.), стылістычныя моўныя пласты (узвышаны, зніжаны, смехавы і інш.). Сінтаксічныя сродкі. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытанне па хатнім заданні |
| 3.5. | Сістэмы прамых і пераносных значэнняў слоў, іх сутнасць, віды, функцыі ў мастацкім творы. Тропы. Віды тропаў. Вобразы слыхавыя, зрокавыя, дотыкавыя, абаняльныя і асязальныя. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытванне па хатнім заданні |
| 3.6. | Вобразны свет сучасных празаікаў, паэтаў і драматургаў. | | | 2 | Творы з сучаснай літаратурна-мастацкай перыёдыкі | 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Пісьмовая кантрольная работа (рэферат) |
| 4. | **Роды, віды і жанры літаратурных твораў (6 гадз.).** | **4** | **2** | | Курс лекцый, камп'ют. прэзентацыі, маст. творы | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.9;1.12; 2.6 | |
| 4.1. | Тыпалогія літаратурных твораў. Роды літаратуры:эпас, лірыка, драма. Ліра-эпічныя віды літаратуры: паэма, балада, байка. Сутнасць, своеасаблівасць, узаемасувязь літаратурных родаў і відаў. | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 4.2. | Разуменне жанравай прыроды літаратурнага твора. Жанравы змест і жанравая форма. Віды і жанры твораў эпічных, драматычных, лірычных.. Цвёрдыя формы (віды) верша. | 2 | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; 3.17; 3.25 | Апытанне па хатнім заданні |
| **5.** | **Проза і паэзія. Вершазнаўства ( 8 гадз.).** | **6** | **2** | | Курс лекцый, | 2.5; 3.4; 3.5; | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | камп’ют. прэзентацыя маст. тэксты | 3.6; 3.14; 3.19 | |
| 5.1. | Асновы вершазнаўства. Верш і паэзія. Верш і проза. Рытміка. Метрыка. Сістэмы вершавання. | 2 | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытанне па хатнім заданні |
| 5.2. | Рыфміка. Рыфма і рыфмоўка. Віды і функцыі рыфмы. Рыфмова-клаўзальная схема. | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 5.3 | Строфіка. Віды строфаў. Класічныя віды строфаў: санеты, трыялеты, тэрцыны, актавы і інш. Страфічныя комплексы (вянкі санетаў, вянкі вянкоў санетаў і інш.). | 2 | | | | | Вуснае выбарачнае апытанне |
| **6.** | **Змест і форма літаратурнага твора ( 8 гадз.).** | **4** | **2** | **2** | Лекцыя, камп’ют. прэзентацыя, маст. літ. | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.9;1.12; 2.6; | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 6.1. | Змест і форма літаратурнага твора, іх дыялектычнае адзінства. Разуменне паэтыкі як формы мастацкага творы ў яе сэнсавыяўленчай сутнасці. | 2 | | | | | |
| 6.2. | Катэгорыі зместу эпічнага празаічнага літаратурнага твора: ідэйная скіраванасць, тэматыка, праблематыка, сюжэт, канфлікт і інш. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11 | Апытанне па хатнім заданні |
| 6.3. | Катэгорыі формы (паэтыкі) лірычнага вершаванага твора: метрыка, рытміка, рыфміка, строфіка, паэтычны сінтаксім і інш. | 2 | | 2 | Вучэбныя дапаможнікі. | 3.7; 3.8; 3.20 | Кантрольная пісьмовая работа |
| 7. | **Літаратурны працэс (4 гадз.).** | **2** | **2** | | Лекцыя, камп’ют. прэзентацыя, маст. літ. | | |
| 7.1. | Літаратурныя метады і напрамкі. Стыль пісьменніка. Стылёвыя плыні ў літаратуры. Літаратурныя сувязі. Мастацкі пераклад. | 2 | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5; 1.9; 3.2; 3.15 | Вуснае выбарачнае апытанне |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА

## Спецыяльнасць 1-21 05 04 Славянская філалогія

| | | Колькасць гадзін | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю заняткаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | КСР – кіруемая самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| . | **Усяго аўдыторных гадзін – 52, з іх:** | **26** | **20** | **6** | | | |
| **1.** | **Літаратуразнаўства як навука ( 10 гадз.)** | **6** | **4** | | Курс лекцый, плакат «Літаратуразнаўства як навука» | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.9;1.12; 2.6; 3.21 | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 1.1. | Літратуразнаўства як навука (доказ), сувязь яго з лінгвістыкай, гуманітарнымі дысцыплінамі, ідэалогіяй. Вучэбная літаратура. | 2 | | | | | |
| 1.2. | Галоўныя галіны літаратуразнаўства. Сутнасць гісторыі літаратуры і літаратурнай крытыкі, іх | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; | Апытванне па хатнім |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | блізкасць і адрозненне. | | | | | 1.1.12; 2.6; | заданні |
| 1.3. | Тэорыя літаратуры як літаратуразнаўчая дысцыпліна.Сутнасць, азначэнне, раздзелы: паэтыка, эстэтыка літараткры, тэорыя літаратурнага працэсу, метадалогія літ-ва. | 2 | | | | | |
| 1.4. | Дапаможныя галіны літаратуразнаўства: гісторыяграфія, бібліяграфазнаўства, тэксталогія, кнігазназнаўства, архівазнаўства, археаграфія, палеаграфія, музеязнаўства, бібліятэказнаўства, біяграфістыка, храналогія. | 2 | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.1.12; 2.6; | Апытванне па хатнім заданні |
| **2.** | **Літаратура як від мастацтва (4 гадз.).** | **2** | | **2** | Курс лекцый, камп'ютар. прэзентацыі, маст. тэксты | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.9;1.12; 2.6; 3.24 | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 2.1. | Навуковае і мастацкае пазнанне жыцця. Функцыі літаратуры Літаратура і іншыя віды мастацтва. Літаратура і грамадскае жыццё.. | 2 | | | | | |
| 2.2. | Мастацкая тыпізацыя. Разуменне тыповага ў жыцці і літаратуры. Прыёмы і спосабы тыпізацыі. | | | 2 | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытванне па хатнім заданні |
| **3**. | **Літаратурны вобраз (12 гадз.).** | **4** | **6** | **2** | Курс лекцый, камп'ют. прэзентацыі, маст. тэксты | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.9;1.12; 2.6; 3.10; 3.16. 3.24 | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 3.1. | Вобразная сутнасць мастацтва. Тэрмін «вобраз», яго разуменне, шматзначнасць у літаратуры. Віды вобразаў. Мікравабразы і макравобразы. | 2 | | | | | |
| 3.2. | Вобраз-персанаж і спосабы яго стварэння. Вобраз і прататып. Вобраз лірычнага героя. Вечныя вобразы. | 2 | | | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.3. | Вобразы прасторы і прадметнага свету. Хранатоп. Пейзаж і локус. Вобразы індывідуальныя, хара́ктарныя, тыпавыя, вобразы-матывы і топасы, архетыпы, міфалагемы/міфемы. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытванне па хатнім заданні |
| 3.4. | Вобразныя магчымасці нацыянальнай мовы: вузкаўжывальная лексіка (дыялектызмы, жарганізмы, аргатызмы, прафесіяналізмы і г. д.), стылістычныя моўныя пласты (узвышаны, зніжаны, смехавы і інш.). Сінтаксічныя сродкі. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытанне па хатнім заданні |
| 3.5. | Сістэмы прамых і пераносных значэнняў слоў, іх сутнасць, віды, функцыі ў мастацкім творы. Тропы. Віды тропаў. Вобразы слыхавыя, зрокавыя, дотыкавыя, абаняльныя і асязальныя. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытванне па хатнім заданні |
| 3.6. | Вобразны свет сучасных празаікаў, паэтаў і драматургаў. | | | 2 | Творы з сучаснай літаратурна-мастацкай перыёдыкі | 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Пісьмовая кантрольная работа (рэферат) |
| 4. | **Роды, віды і жанры літаратурных твораў (6 гадз.).** | **4** | **2** | | Курс лекцый, камп'ют. прэзентацыі, маст. творы | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.9;1.12; 2.6 | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 4.1. | Тыпалогія літаратурных твораў. Роды літаратуры:эпас, лірыка, драма. Ліра-эпічныя віды літаратуры: паэма, балада, байка. Сутнасць, своеасаблівасць, узаемасувязь літаратурных родаў і відаў. | 2 | | | | | |
| 4.2. | Разуменне жанравай прыроды літаратурнага твора. Жанравы змест і жанравая форма. Віды і жанры твораў эпічных, драматычных, лірычных. Цвёрдыя формы (віды) верша. | 2 | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; 3.17; 3.25 | Апытванне па хатнім заданні |
| **5.** | **Проза і паэзія, Вершазнаўства ( 8 гадз.).** | **6** | **2** | | Курс лекцый, | 2.5; 3.4; 3.5; | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | камп'ют. прэзентацыя, маст. тэксты. | 3.6; 3.14; 3.19 | |
| 5.1. | Асновы вершазнаўства. Верш і паэзія. Верш і проза. Рытміка. Метрыка. Сістэмы вершавання. | 2 | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11; 3.1;.3.3; 3.11;.3.12; | Апытванне па хатнім заданні |
| 5.2. | Рыфміка. Рыфма і рыфмоўка. Віды і функцыі рыфмы. Рыфмова-клаўзальныя схемы. | 2 | | | Курс лекцый, камп'ют. прэзентацыя, маст. тэксты. | | і |
| 5.3 | Строфіка. Віды строфаў. Класічныя віды строфаў: санеты, трыялеты, тэрцыны, актавы і інш. Страфічныя комплексы (вянкі санетаў, вянкі вянкоў санетаў і інш.). | 2 | | | | | |
| **6.** | **Змест і форма літаратурнага твора ( 8 гадз.).** | **2** | **4** | **2** | Курс лекцый, камп'ют. прэзентацыя | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5;1.8; 1.9;1.12; 2.6; | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 6.1. | Змест і форма літаратурнага твора, іх дыялектычнае адзінства. Разуменне паэтыкі як формы мастацкага творы ў яе сэнсавыяўленчай сутнасці. | 2 | | | | | |
| 6.2. | Катэгорыі зместу эпічнага празаічнага літаратурнага твора: ідэйная скіраванасць, тэматыка, праблематыка, сюжэт, канфлікт і інш. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.6; 1.11 | Апытванне па хатнім заданні |
| 6.3. | Катэгорыі формы (паэтыкі) лірычнага вершаванага твора: метрыка, рытміка, рыфміка, строфіка, паэтычны сінтаксім і інш. | | 2 | 2 | Вучэбныя дапаможнікі | 3.7; 3.8; 3.20 | Кантрольная пісьмовая работа |
| 7. | **Літаратурны працэс (4 гадз.).** | **2** | **2** | | Лекцыя, камп'ют. прэзентацыя | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5; 1.9; 3.2; 3.15 | Вуснае выбарачнае апытанне |
| 7.1. | Літаратурныя метады і напрамкі. Стыль пісьменніка. Стылёвыя плыні ў літаратуры. Літаратурныя сувязі. Мастацкі пераклад. | 2 | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі | 1.2; 1.3; 1.4; 1.5; 1.9; 3.2; 3.15 | Апытванне па хатнім заданні |

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА
## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


**1. Вучэбныя дапаможнікі**

***1.1.*** *Абрамович Г.* Введение в литературоведение / Г. Абрамович. М., 1975.

**1.2**. Введение в литературоведение / под ред. Г. Н. Поспелова. М., 1988.

**1.3.** Введение в литературоведение: Литературное произведение: основные понятия и термины / Л. В. Чернец [и др.]. М., 1999.

**1.4.** Введение в литературоведение: учебник / под ред. Л. М. Купчанова. М., 2005.

***1.5.*** *Лазарук, М., Ленсу, А.* Уводзіны ў літаратуразнаўства. 2-е выд. / М. Лазарук, А. Ленсу. Мінск, 1982.

***1. 6.*** *Майсейчык, Л. А.* Уводзіны ў літаратуразнаўства: практыкум / Л. А. Майсейчык. Мінск, 1992.

**1. 7.** Основы литературоведения / под ред. В. П. Мещерякова. М., 2000.

***1. 8.*** *Рагойша, В. П.* Уводзіны ў літаратуразнаўства: вучэб дапам. У 2 ч. Ч. 2: Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / В. П. Рагойша, М. П. Кенька, Т. А. Марозава; пад. Рэд. В. П. Рагойшы. Мінск, 2010.

***1. 9.*** *Рагойша, В. П.* Уводзіны ў літаратуразнаўства: вучэб. дапам. У 2 ч. Ч. 2: Паэтыка. Тэорыя літаратурнага працэсу / В. П. Рагойша, М. П. Кенька, Т. А. Марозава; пад рэд. В. П. Рагойшы. Мінск, 2012.

***1. 10.*** *Тимофеев, Л.* Основы теории литературы / Л. Тимофеев. М., 1976.

**1. 11.** Уводзіны ў літаратуразнаўства: хрэстаматыя / аўт.-уклад. М. І. Мішчанчук, М. Ф. Шаўлоўская. 3-е выд. Мінск, 2004.

***1. 12*** *Федотов, О. М.* Основы теории литературы. Ч. 1, 2. / О. М. Федотов. М., 2003.

**2. Даведачная літаратура**

2. 1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 тт. / рэдкал.: Г. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 1996–2004.

*2. 2. Лазарук, М. А., Ленсу, А. Я.* Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў. 2-е выд. / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. Мінск, 1996.

2. 3.Литературный энциклопедический словарь. М., 1987.

2. 4. Литературная энциклопедия терминов и понятий / под ред. В.М.Кожевникова и П.А.Николаева. М., 2003.

*2. 5. Рагойша, В. П.* Паэтычны слоўнік. 3-е выд. / В. П. Рагойша. Мінск, 2004.

*2. 6. Рагойша, В. П.* Слоўнік – мінімум па літаратуразнаўству / В. П. Рагойша. Мінск, 2000.

*2. 7. Рагойша, В. П.* На шляху да Парнаса: Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. Мінск, 2003.

2. 8. Словарь литературоведческих терминов / ред.-сост. Л.И.Тимофеев и С.В.Тураев. М., 1974.

2. 9. Энциклопедический словарь юного филолога / редкол.: Г.В.Степанов (глав. ред.) [и др.]. М., 1987.

2. 10. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5-і т. / рэдкал.: І.П.Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 1985–1987.

**3. Дапаможная літаратура.**

*3. 1. Андреев, А. Н.* Целостный анализ литературного произведения / А. Н. Андреев. Минск, 1995.

*3. 2. Гиршман, М. М.* Стиль литературного произведения / М. М. Гиршман. Донецк, 1984.

*3. 3. Есин, А. Б.* Принципы и приемы анализа литературного произведения / А. Б. Есин. М., 2001.

*3. 4.Гаспаров, М. Л.* Очерк истории европейского стиха / М. Л. Гаспаров. М., 1989.

*3. 5. Гаспаров, М. Л.* Очерк истории русского стиха / М. Л. Гаспаров. М., 1984.

*3. 6. Гаспаров, М. С.* Современный русский стих / М. С. Гаспаров. М., 1989

*3. 7. Гілевіч, Н. С.* Паэтыка беларускіх загадак / Н. С. Гілевіч. Мінск, 1976.
*3. 8. Гілевіч, Н. С.* Паэтыка беларускай народнай лірыкі / Н. С. Гілевіч. Мінск, 1975.
*3. 10. Грехнев, В. А.* Словесный образ и литературное произведение / В. А. Грехнев. Н. Новгород, 1997.
*3. 11. Корман, Б. О.* Изучение текста художественного произведения / Б. О. Корман. М., 1972.
*3.12. Купина, Н. А., Николаева, Н. А.* Филологический анализ худ. текста: практикум / Н. А. Купина, Н. А. Николаева. М., 2003.
*3. 13. Лазарук, М. А., Ленсу, А. Я.* Пытанні тэорыі літаратуры / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. Мінск, 1964.
*3. 14. Лотман, Ю. М.* Анализ поэтического текста. Структура стиха / Ю. М. Лотман. М., 1972.
*3. 15. Лебединский, С. И.* Теория и практика перевода / С. И. Лебединский. М., 2001.
*3.16.Мартынава, Э. М.* Мастацкая дэталь у творы / Э. М. Мартынава. Мінск, 1977.
*3. 17. Маслова, В. А.* Филологический анализ художественного текста / В. А. Маслова. Минск, 2000.
*3. 18. Пяткевіч, А.* Сюжэт. Кампазіцыя. Характар / А. Пяткевіч. Мінск, 1981.
*3. 19. Ралько, І. Д.* Беларускі верш: пытанні гісторыі і тэорыі / І. Д. Ралько. Мінск, 1969.
*3. 20.Томашевский, Б. В.* Теория литературы. Поэтика / Б. В. Томашевский. М., 1996.
3. 21. Тэксталогія і яе дапаможныя навукі: вучэб.-метад. дапам. / В. П. Рагойша [і інш.]; пад рэд. В. П. Рагойшы. Мінск, 2015.
*3. 22. Хализев, В. Е.* Теория литературы / В. Е. Хализев. М., 1999.
*3. 23. Шпакоўскі, І. С.* Структура вершаванага вобраза / І. С. Шпакоўскі. Мінск, 1972.
*3. 24. Шпакоўскі, І. С.* Тыпізацыя ў лірыцы / І. С. Шпакоўскі. Мінск, 1980.
*3. 25. Элсанек, А. Я.* Основы литературоведения: анализ художественного произведения / А. Я. Элсанек. М., 2001.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ (КСР)

### Формы арганізацыі КСР

*вывучэнне канспекта лекцый па дысцыпліне з выдзяленнем ключавых палажэнняў і паняццяў;

*пісьмовыя і вусныя адказы на кантрольныя пытанні па тэмах лекцый і семінарскіх заняткаў;

*работа са слоўнікамі, даведнікамі і энцыклапедычнымі выданнямі;

*пошукі ў даведачна-бібліяграфічных аддзелах бібліятэк і ў Інтэрнеце;

*падрыхтоўка вусных выступленняў на семінарскіх занятках;

*напісанне рэфератаў па прапанаванай выкладчыкам тэме;

*падбор ілюстрацыйнага матэрыялу па вывучаемай тэме;

*выкананне дамашніх і аўдыторных кантрольна-практычных заданняў.

### Тэматыка КСР

**1. Мастацкая тыпізацыя. Разуменне тыповага ў жыцці і літаратуры.**

**Мэта работы**: выявіць веданне паняцця “тыповае”, увасобленае ў мастацкіх творах у катэгорыях гістарычных, нацыянальных, сацыяльна-

класавых, псіхалагічных і інш. Прывесці прыклады з рэалістычных літаратурных твораў эпічных, лірычных і драматычных. Паказаць веданне сродкаў і спосабаў тыпізацыі пры стварэнні літаратурных вобразаў-персанажаў (на выбар студэнтаў).

**Форма работы**: вуснае выказванне студэнта на пастаўленае выкладчыкам пытанне, ілюстраванне адказу прыкладамі з самастойна выбраных студэнтам твораў.

### 2. Літаратурны вобраз.

**Мэта работы**: прадэманстраваць веданне сутнасці літаратурнага вобраза ў яго розных значэннях: вобраз-персанаж, вобраз-рэч, вобраз-пейзаж, вобраз-троп і г.д. Паказаць арыгінальнасць, тыповасць вобразнага свету пісьменніка на канкрэтных прыкладах пры аналізе тых ці іншых твораў мастацкай літаратуры.

**Форма работы**: напісанне рэфератаў з аналізам твораў пэўных відаў і жанраў літаратуры (проза, паэзія, драматургія, літаратурная крытыка, мастацкі пераклад) у адным з сучасных (за 2015 год) беларускіх літаратурна-мастацкіх перыядычных выданняў (“Полымя”, “Дзеяслоў”, “Маладосць”, “Нёман”, “Літаратура і мастацтва”) – на выбар студэнта. Рэферат выконваецца дома, правяраецца выкладчыкам і на занятках падчас КСР даецца яму ацэнка. Выстаўленая адзнака ўваходзіць у лік адзнак рэйтынгавай сістэмы ацэнкі ведаў студэнтаў.

### 3. Змест і форма літаратурнага твора.

**Мэта работы**: выявіць веданне катэгорый формы (паэтыкі) лірычных вершаваных твораў.

**Форма работы**: пісьмовая адказы на кантрольныя пытанні.

Кожнаму студэнту выдаецца канверт з заданнем, у якім – тэкст лірычнага вершаванага твора і канкрэтныя пытанні, звязаныя з рознымі катэгорыямі паэтыкі (формы) твора: метрыкі, рытмікі, рыфмікі, фонікі, страфікі, сістэмай прамых значэнняў слоў, тропамі, паэтычным сінтаксісам, відавой і жанравай асаблівасцямі твора. Студэнты пісьмова адказваюць на пастаўленыя пытанні і здаюць работы выкладчыку. Праверка работ ажыццяўляецца выкладчыкам па-за аўдыторыяй. Вынікі праверкі паведамляюцца студэнтам падчас практычных заняткаў па гэтай тэме разам з дадатковым вусным выбарачным апытаннем.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

*вуснае апытанне ў час заняткаў;

*пісьмовая кантрольная работа;

*пісьмовыя адказы на кантрольныя пытанні па розных раздзелах дысцыпліны;

*тэсты па асобных раздзелах дысцыпліны;

*напісанне рэфератаў па вызначанай выкладчыкам тэме (тэмах);

*вусны экзамен.

Ацэнка вынікаў вывучэння дысцыпліны праводзіцца ў адпаведнасці з крытэрыямі ацэнкі ведаў і кампетэнцый студэнтаў, выкладзенымі ў пісьме Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 21-04-1/105 ад 22.12. 2003 г. і ў адпаведнасці з Палажэннем аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў па дысцыпліне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (загад рэктара № 382-ОД ад 18.08.2015 г.).

## ПЕРАЛІК ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## Спецыяльнасць 1-21 05 01 беларуская філалогія (па напрамках)

### Дапаможныя галіны літаратуразнаўства (2 гадз.)

Сутнасць і значэнне для літаратуразнаўства такіх дапаможных галін навукі, як гісторыяграфія, бібліяграфазнаўства, тэксталогія, кнігазназнаўства, архівазнаўства, археаграфія, палеаграфія, музеязнаўства, бібліятэказнаўства, біяграфістыка, храналогія. Прыклады прац па гэтых галінах гуманітарнай навукі. Канкрэтная ілюстрацыя іх дапамогі літаратуразнаўству.

### Літаратурны вобраз (6 гадзін)

Вобразы прасторы і прадметнага свету. Хранатоп. Пейзаж і локус. Вобразы індывідуальныя, хара́ктарныя, тыпавыя, вобразы-матывы і топасы, архетыпы, міфалагемы/міфемы.

Вобразныя магчымасці нацыянальнай мовы: вузкаўжывальная лексіка (дыялектызмы, жарганізмы, аргатызмы, прафесіяналізмы і г. д.), стылістычныя моўныя пласты (узвышаны, зніжаны, смехавы і інш.). Сінтаксічныя сродкі (паўторы, недасказы, перастаноўкі і інш.).

Сістэмы прамых і пераносных значэнняў слоў, іх сутнасць, віды, функцыі ў мастацкім творы. Тропы. Віды тропаў: метафары, параўнанні, гіпербалы, літоты, метаніміі, сінекдахі і інш. Вобразы слыхавыя, зрокавыя, дотыкавыя, абаняльныя і асязальныя.

### Разуменне жанравай прыроды літаратурнага твора ( 2 гадз.)

Жанравы змест і жанравая форма. Віды і жанры твораў эпічных (раман – гістарычны, прыгодніцкі, сацыяльна-бытавы і інш.), драматычных (камедыя – сацыяльна-бытавая, лірычная, фантастычная і інш.), лірычных (песня – любоўная, гістарычная, вясельная і інш.). Цвёрдыя формы (віды) верша: санет, трыялет, актава, тэрцына і інш.

### Асновы вершазнаўства (2 гадз.)

Верш і паэзія. Верш і проза. Рытміка. Метрыка. Сістэмы вершавання: антычная, танічная, сілабічная, сілаба-танічная, верлібрыстычная. Рытмастваральныя кампаненты (асноўныя і дапаможныя) сілаба-танічнага верша. Народны танічны верш. Раёшнік. Віды літаратурнага танічнага верша: акцэнтны, акцэнтна-складовы, дольнік, тактавік. Каламыйкавы верш.

### Змест літаратурнага твора (2 гадз.)

Катэгорыі зместу эпічнага празаічнага літаратурнага твора: ідэйная скіраванасць, тэматыка, праблематыка і інш. Канфлікт, тыпы і віды канфлікта, сувязь канфлікта з сюжэтам і кампазіцыяй твора. Сюжэт, яго галоўныя кампаненты, сюжэтныя лініі. Пазасюжэтныя кампаненты твора. Кампазіцыя, віды кампазіцыі, кампазіцыйныя прыёмы, сувязь з сюжэтам.

### Літаратурны працэс (2 гадз.)

Літаратурныя метады і напрамкі. Метады класіцызму, сентыменталізму, рамантызму, рэалізму і мадэрнізму, іх сутнасць, гісторыя існавання. Прыклады з гісторыі літаратуры. Літаратурныя напрамкі: крытычны рэалізм, футурызм, сімвалізм, імажынізм, сацыялістычны рэалізм, постмадэрнізм і інш. Стыль пісьменніка як літаратуразнаўчая катэгорыя, адрозненне яе ад чыста моўнага разумення. Стылёвыя плыні ў літаратуры. Літаратурныя сувязі, іх віды: кантактрыя, генетычныя, тыпалагічныя. Мастацкі пераклад. Разуменне адэкватнасці мастацкага перакладу.

## ПЕРАЛІК ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ
## Спецыяльнасць 1-21 05 04 славянская філалогія

### Галоўныя і дапаможныя галіны літаратуразнаўства (4 гадз.)

Галоўныя галіны літаратуразнаўства. Сутнасць гісторыі літаратуры, яе раздзелаў: аўтаразнаўства, гісторыі нацыянальнай, рэгіянальнай і сусветнай літаратур. Прыклады. Літаратурная крытыка, яе раздзелы: гісторыя крытыкі і тэорыя крытыкі. Метадалагічныя праблемы літаратурнай крытыкі.Блізкасць і адрозненне паміж гісторыяй літаратуры і літаратурнай крытыкай.

Сутнасць і значэнне для літаратуразнаўства такіх дапаможных галін навукі, як гісторыяграфія, бібліяграфазнаўства, тэксталогія, кнігазназнаўства, архівазнаўства, археаграфія, палеаграфія, музеязнаўства, бібліятэказнаўства, біяграфістыка, храналогія.

### Літаратурны вобраз (6 гадзін)

Вобразная сутнасць мастацтва. Тэрмін «вобраз», яго разуменне, шматзначнасць у літаратуры: цэласны малюнак чалавечага жыцця, створаны пісьменнікам у яго творы; вобраз-персанаж; вобраз-пейзаж; троп і г. д. Віды вобразаў. Мікравабразы і макравобразы.

Вобраз-персанаж і спосабы яго стварэння (учынкі, мова, характарыстыка вуснамі іншых персанажаў, прамая аўтарская характарыстыка і інш.). Падкрэсленне, выдзяленне асноўнай рысы характару. Вобраз і прататып. Вобразная тыпізацыя. Вобраз лірычнага героя. Вечныя вобразы.

Вобразы прасторы і прадметнага свету. Хранатоп. Пейзаж і локус. Вобразы індывідуальныя, хара́ктарныя, тыпавыя, вобразы-матывы і топасы, архетыпы, міфалагемы/міфемы.

**Разуменне жанравай прыроды літаратурнага твора ( 2 гадз.)**

Жанравы змест і жанравая форма. Віды і жанры твораў эпічных (раман – гістарычны, прыгодніцкі, сацыяльна-бытавы і інш.), драматычных (камедыя – сацыяльна-бытавая, лірычная, фантастычная і інш.), лірычных (песня – любоўная, гістарычная, вясельная і інш.). Цвёрдыя формы (віды) верша: санет, трыялет, актава, тэрцына і інш.

**Асновы вершазнаўства (2 гадз.)**

Верш і паэзія. Верш і проза. Рытміка. Метрыка. Сістэмы вершавання: антычная, танічная, сілабічная, сілаба-танічная, верлібрыстычная. Рытмастваральныя кампаненты (асноўныя і дапаможныя) сілаба-танічнага верша. Народны танічны верш. Раёшнік. Віды літаратурнага танічнага верша: акцэнтны, акцэнтна-складовы, дольнік, тактавік. Каламыйкавы верш.

**Змест і форма літаратурнага твора (4 гадз.)**

Катэгорыі зместу эпічнага празаічнага літаратурнага твора: ідэйная скіраванасць, тэматыка, праблематыка і інш. Канфлікт, тыпы і віды канфлікта, сувязь канфлікта з сюжэтам і кампазіцыяй твора. Сюжэт, яго галоўныя кампаненты, сюжэтныя лініі. Пазасюжэтныя кампаненты твора. Кампазіцыя, віды кампазіцыі, кампазіцыйныя прыёмы, сувязь з сюжэтам.

Катэгорыі формы (паэтыкі) лірычнага вершаванага твора. Метрыка і рытміка, іх сутнасць, сувязь і адрозненне. Метр, рытм, памер верша. Фоніка. Рыфма і рыфмоўка. Віды і функцыі рыфмы ў паэтычным творы. Строфіка Віды традыцыйных і новых строфаў. Страфічныя кампазіцыі. Паэтычны сінтаксіс, яго віды і функцыі ў вершы.

**Літаратурны працэс (2 гадз.)**

Літаратурныя метады і напрамкі. Метады класіцызму, сентыменталізму, рамантызму, рэалізму і мадэрнізму, іх сутнасць, гісторыя існавання. Прыклады з гісторыі літаратуры. Літаратурныя напрамкі: крытычны рэалізм, футурызм, сімвалізм, імажынізм, сацыялістычны рэалізм, постмадэрнізм і інш. Стыль пісьменніка як літаратуразнаўчая катэгорыя, адрозненне яе ад чыста моўнага разумення. Стылёвыя плыні ў літаратуры. Літаратурныя сувязі, іх віды: кантактрыя, генетычныя, тыпалагічныя. Мастацкі пераклад. Разуменне адэкватнасці мастацкага перакладу.

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнні, прынятыя кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Тэорыя літаратуры | Тэорыя літаратуры | Няма | Зацвердзіць. Пратакол № 9 ад 18.05.2016 |
| Фалькла-рыстыка | Тэорыі літаратуры | Няма | Зацвердзіць. Пратакол № 9 Ад 18.05.2916 |
| Гісторыя рускай літаратуры | Рускай літаратуры | Няма | Зацвердзіць. Пратакол № 9 Ад 18.05.2016 |

ДАПАЎНЕННІ І ЗМЯНЕННІ Ў ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЕ
ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
НА _____________ ВУЧЭБНЫ ГОД

| №№ пп | Дапаўненні і змяненні | Прычыны |
|---|---|---|
| | Зменаў няма. | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры тэорыі літаратуры (пратакол № 9 ад 18.05.2016 г.)

Загадчык кафедры

_____________________ _____________________________________________
(ступень, званне) (подпіс) (Прозвішча, імя, імя па бацьку)

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дэкан факультэта / Заг. агульнаўніверсітэцкай кафедры

______________________________________________________________
(ступень, званне) (подпіс) (Прозвішча, імя, імя па бацьку)